

ЗРОК ЗНІКАЕ... НЕЗАЎВАЖНА **8**

НЕ ТРЭБА ВЫХОЎВАЦЬ ДЗЯЦЕЙ... **11**



Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

4 ВЕРАСНЯ 2019 г. СЕРАДА № 167 (29034)

## ЦЫТАТА ДНЯ



*З 1 верасня павялічаныя асобныя нормы спажывання жыллёва-камунальных паслуг для разліку безнаяўных жыллёвых субсідый. Гэта прадугледжана пастановай Савета Міністраў № 588 ад 2 верасня 2019 года. У прыватнасці, норма (нарматыў) спажывання паслуг па тэхнічным абслугоўванні ліфта складзе Br1,4 у месяц (раней Br1,19), па санітарным утрыманні дапаможных памяшканняў жылога дома — Br0,65 у месяц (раней Br0,53). Павялічаны таксама нормы пакрыцця выдаткаў на электраэнергію ў шматкватэрным жылым доме арганізацый, якія ажыццяўляюць эксплуатацыю жыллёвага фонду і (або) аказваюць жыллёва-камунальныя паслугі. На аднаго чалавека норма кампенсацый выдаткаў на электраэнергію, спажытую на асвятленне дапаможных памяшканняў і работу абсталявання, за выключэннем ліфтаў, складзе Br0,6 у месяц (раней Br0,39), электраэнергію, спажытую на работу ліфтаў — Br0,66 у месяц (раней Br0,47).*

# МЫ МОЖАМ ПАКЛАСЦІ КАНЕЦ ТЭРАРЫЗМУ

**Учора і сёння ў Мінску праходзіць Міжнародная канферэнцыя высокага ўзроўню пад агульнай назвай «Барацьба з тэрарызмам пры дапамозе інавацыйных падыходаў і выкарыстання новых і ўзнікаючых тэхналогій». Маштабнае мерапрыемства, арганізаванае Міністэрствам замежных спраў Беларусі і Контртэрарыстычным упраўленнем ААН, сабрала прадстаўнікоў 55 краін і шэрагу ўплывовых міжнародных арганізацый, у тым ліку ААН, АБСЕ, Інтэрпола, АДКБ, ШАС. На сесіі адкрыцця форуму выступіў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка. Ён з першых слоў заявіў, што ў нашых сілах перамагчы тэрарызм.**



Фота БелТА.

## Пагроза датычыцца ўсіх

«Так, мы можам пакласці канец тэрарызму. Не сёння, не заўтра, не адразу. Але толькі пры адной умове — калі мы гэтага захочам. Вы, вярнуўшыся дамоў з Беларусі, і мы, застаўшыся ў Беларусі, павінны прыкласці максімум намаганняў, каб пакласці канец тэрарызму і будаваць новую планету», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Але для гэтага, перш за ўсё прафесіяналам, давядзецца пераканаць улады. Такія канферэнцыі, мазгавыя атакі, жаданне іх удзельнікаў так ці інакш прымусяць кіраўнікоў дзяржаў прыслухацца.

Прэзідэнт адзначыў, што тэма канферэнцыі надзвычай важная для гарантавання бяспекі кожнай дзяржавы, на якім кантыненце яна б ні знаходзілася. Ён нагадаў: тэрарызм стаў адной з самых магутных і адчувальных пагроз глабальнай бяспецы, якая не ведае ні дзяржаўных, ні маральных межаў. Яго ахвярамі становяцца звычайныя людзі, у тым ліку старыя, жанчыны, дзеці. А тэхналогіі, што тэрарысты выкарыстоўваюць пры падрыхтоўцы атак, развіваюцца з хуткасцю сусветнага інфармацыйнага і тэхнічнага прагрэсу.

СТАР. 2

Спецыяльны рэпартаж

# ВЯЛІКАЕ ЗАСЯЛЕННЕ

### «Звязда» адправілася ў Пінск і даведалася, што прыцягвае моладзь у рэгіянальныя ўніверсітэты

**Пакуль сталічныя студэнты і іх бацькі істэрычна матаюцца па тлумным вераснёўскім Мінску ў пошуках больш-менш прыстойнага і недарагога здымнага жылля, хлопцы і дзяўчаты, залічаныя сёлета ў Палескі дзяржуніверсітэт, спакойна асвойваюцца ў самым незвычайным кампусе Беларусі.**

СТАР. 5




Фота Ганны КУРАК.

## КОРАТКА

• **Ліцэнзаванне асобных відаў эканамічнай дзейнасці адмяняецца ў Беларусі з 1 кастрычніка.**

• Сусветны банк адзначае сур'ёзны падыход Беларусі да дарожнай карты рэформаў.

• **Птушкай 2020 года Беларусі аб'яўлены глушэц.**



• Вялікая выстаўка графікі «Пабла Пікаса. «Параграфы» адкрыецца ў Гомелі ў карціннай галерэі Г. Х. Вашчанкі.




# ГРЭЦЦА І НЕ ЗАГАРЭЦЦА

**Пачатак верасня — фактычна адзіная магчымасць «ускочыць у апошні вагон» для сур'ёзнай падрыхтоўкі свайго дому да восеньскіх і зімовых халадоў. Хоць слупок тэрмометра ўдзень трымаецца каля адзнакі ў 20 (і нават вышэй!) градусаў — гэта ўсяго толькі апошнія акорды лета-2019. Зіма ж — рэвізор суровы і ніякіх паблажак рабіць не будзе. Таму разам з афіцыйным прадстаўніком Міністэрства па надзвычайных сітуацыях Віталем НАВІЦКІМ «Звязда» аналізуе асноўныя прычыны пажараў у дамах, характэрныя менавіта для халоднай пары года.**

— Летась печы сталі прычынай 1175 пажараў. Прычым калі ўлічыць, што агульная колькасць узгаранняў крыху перавысіла адзнаку ў шэсць тысяч, атрымліваецца, што на долю цагляных памочніц прыйшлося каля 20 % выпадкаў. Гэта шмат. Да таго ж 225 пажараў адбыліся ў выніку парушэння правіл уладкавання, мантажу печаў ды іншых прылад, якія генеруюць цяпло. Але, пагадзіцеся, гэтыя лічбы не супакояць тых, хто панёс ад агню сур'ёзныя страты. Таму зараз, пакуль у Беларусі трымаецца цёплае надвор'е, наведайце сваякоў у вёсцы і пракантралюйце, у якім стане ў іх знаходзіцца печка, ці патрэбны ёй рамонт. Асабліва гэта важна, калі ў сельскай мясцовасці пражываюць вашы родныя і блізкія сталага веку, якім з-за ўзроставых абмежаванняў ужо цяжка прасачыць за тым, каб усё ў іх натуральным шляхам было бяспечна. Пачысціце ды пабяліце комін і корпус печкі. Гэта трэба не толькі для эстэтыкі, але і для таго, каб былі «падсвечаны» месцы, дзе выходзіць чадны газ. Але проста падмазаць шчыліны будзе недастаткова. Праверце, ці не выпадаюць цагліны, ці спраўна працуюць усе засаўкі. І калі выявіцца, што рамонт патрэбны, то не адкладвайце яго на «пасля», а прыводзьце печ у бяспечны стан неадкладна. Старых сваякоў, калі ёсць магчымасць, забярыце на зіму ў горад, каб яны перачакалі маразы і снегапады ў больш камфортных умовах.

СТАР. 4

ISSN 1990 - 763X

# ПАЗІЦЫЯ БЕЛАРУСІ НЯЗМЕННАЯ

## Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка сустрэўся з Генеральным сакратаром АБСЕ Томасам Грэмінгерам

**Сустрэча адбылася на палях Міжнароднай канферэнцыі высокага ўзроўню, прысвечанай супрацьдзеянню тэрарызму, якая цяпер праходзіць у Мінску.**

«У нас ужо склалася добрая традыцыя абмяркоўваць асноўныя пытанні нашага ўзаемадзеяння ў Еўропе, я вельмі ўдзячны вам, АБСЕ за ацэнку нашай ролі ў плане бяспекі на кантыненце, — звярнуўся да суразмоўніка кіраўнік беларускай дзяржавы. — Разам з Арганізацыяй Аб'яднаных Нацый вы арганізавалі сур'ёзнае мерапрыемства ў Мінску. Мы гэта вельмі цэнім, удзячныя за тое, што міжнародныя арганізацыі давяраюць Беларусі правядзенне падобных форумаў».

Пры гэтым і Беларусь, і арганізатары такіх форумаў павінны разумець, што абмеркаванні на высокім узроўні надзённых і вострых праблем да многага абавязваюць. «Вы бачыце, што мы стараемся адпавядаць таму ўзроўню даверу, які атрымліваем ад міжнародных арганізацый у плане рэгіянальнай бяспекі. Хачу вас запэўніць, што Беларусь у гэтым напрамку будзе заўсёды ісці, і вы ў асобе нашай краіны заўсёды атрымаеце добрага партнёра, на якога зможаце абаперціся для ўмацавання міру і бяспекі», — паабяцаў Прэзідэнт.

Томас Грэмінгер заўважыў, што гэта ўжо чацвёрты яго візіт у Мінск на працягу года з невялікім. «Хачу выказаць глыбокую падзяку за ваш актыўны ўдзел у справе садзейнічання міру і бяспецы, за ваша актыўнае супрацоўніцтва з АБСЕ, за правядзенне шэрагу сустрэч кантактных груп, за падтрыманне шэрагу ініцыятыў, якія таксама скіраваныя на ўмацаванне міру і бяспекі», — сказаў ён.

Генеральны сакратар падзякаваў таксама за тое, што ў сваім выступленні на канферэнцыі Аляксандр Лукашэнка зноў выказаўся пра неабходнасць перагаворнага працэсу ў фармаце Хельсінкі II.

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.**

# МЫ МОЖАМ ПАКЛАСЦІ КАНЕЦ ТЭРАРЫЗМУ



Фота БелТА.

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

І гэта, упэўнены беларускі лідар, — беспрэцэдэнтны выклік сучаснаму грамадству. Выклік, што не адолеюць паасобку нават самыя магутныя дзяржавы, якімі б слáвым патэнцыялам і перадавымі распрацоўкамі яны ні валодалі.

«Надышоў час усім краінам свету аб'яднаць намаганні ў сістэмнай барацьбе з тэрарыстамі і іх памагатымі, пачаць шырокі міжнародны дыялог. Неабходнасць у сумеснай каардынацыі высілкаў, думаю, відавочная для ўсіх, перш за ўсё, прафесіяналаў, прысутных у гэтай зале», — звярнуўся да ўдзельнікаў канферэнцыі выступовец. Галоўная роля ў гэтай місіі належыць Арганізацыі Аб'яднаных Нацый, дадаў ён. А Беларусь удзяляе ва ўсіх асноўных універсальных дамовах, распрацаваных пад эгідай ААН.

### Змагацца трэба разам

У 2006 годзе наша краіна выступіла за прыняцце Глабальнай контртэрарыстычнай стратэгіі — першага дакумента, які вызначаў сусветны падыход да барацьбы з тэрарызмам. Беларусь працягвае падтрымліваць усе ініцыятывы ў рамках ААН: умацоўвае партнёрскія сувязі ў сферы антытэрору, удзельнічае ў абмене спецыялізаванай інфармацыяй і перадавым досведам, фарміраванні сеткі каардынатараў па барацьбе з тэрарызмам.

Але паколькі маштаб тэрарыстычнай актыўнасці сёння патрабуе выхаду за рамкі адной арганізацыі, Аляксандр Лукашэнка пераканаы: адзіны правільны спосаб магутна і эфектыўна процістаяць пагрозе — стварэнне згуртаванага антытэрарыстычнага фронту сіламі ААН, АБСЕ, Еўразаюза, АДКБ, СНД, ШАС і іншых міжнародных арганізацый.

Беларускі лідар лічыць таксама, што ідэя аб'яднаць два рэгіёны (АБСЕ і АСЕАН) пад эгідай контртэрарыстычнай канферэнцыі ў Мінску актуальная і сучасная.

«У Беларусі, на шчасце, няма сістэмных прычын для экстрэмісцкай дзейнасці, заснаванай на рэлігійнай, этнічнай ці сацыяльнай нецярпімасці», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

Ён адзначыў, што Беларусь дзякуючы знаходжанню ў цэнтры Еўропы служыць надзейным фарпостам у выяўленні замежных тэрарыстаў-баевікоў у пасажырскіх і міграцыйных плынях. Гэтаму садзейнічае развітая пагранічная інфраструктура, шматузроўневая сістэма забеспячэння бяспекі, пасляховы досвед супрацоўніцтва з кампетэнтнымі органамі іншых дзяржаў і профільнымі міжнароднымі арганізацыямі.

Для ўмацавання нацыянальнай сістэмы маніторынгу грамадскай бяспекі рэзідэнты беларускага Парка высокіх тэхналогій стварылі і прасоўваюць на рынку перадавыя праграмныя прадукты, у тым ліку з выкарыстаннем штучнага інтэлекту.

### Зона рызыкі — глабальная сетка

Беларускі лідар назваў інтэрнэт вялікай зонай рызыкі. Пагрозы, якія фарміруюцца ў кіберпрасторы, маюць транснацыянальны і схаваны характар. Сыход злачынцаў у «цёмную сетку» робіць цяжкім кантроль. Тэрарысты актыўна выкарыстоўваюць сацыяльныя сеткі для прапаганды і вярбоўкі новых прыхільнікаў, лічбавыя тэхналогіі — для фінансавага падсілкоўвання. І гэта яшчэ адзін выклік для глабальнага контртэрарыстычнага фронту.

«Стварылі гэту «цацку» вялікую і зараз не ведаем, што з ёй рабіць. Дакладней, ведаем, нават вельмі добра ведаем, але не жадаем рабіць тое, што мы разумеем і што трэба рабіць. І яшчэ. Ствараючы такую «цацку», мы павінны разумець, што калі яна з аднаго боку нясе дабро для чалавецтва (а інтэрнэт — гэта з аднаго боку дабро), значыць, трэба падумаць і аб тым, а што можа быць тут дрэннага?» — адзначыў Аляксандр Лукашэнка.

У якасці прыкладу Аляксандр Лукашэнка назваў «Даркнэт» — «цёмную сетку». Ён прызнаўся, што сам дагэтуль нічога пра тое не ведаў, але, напрыклад, сённяшнія дзеці такое ўжо ведаюць.

«Цяпер асобныя краіны свету азадачаныя праблемай забеспячэння «свабоды інтэрнэту». Свабоды... Але што маецца на ўвазе пад гэтым тэрмінам? Дзе мяжа паміж свабодай зносін ці самавыяўлення і бесконтрольнымі ці бяскарнымі паводзінамі ў сусветнай лічбавай прасторы?» — задаў пытанне беларускі лідар.

Ён падкрэсліў, што ў Беларусі, як суверэннай краіны, ёсць уласнае меркаванне на тэмы маральных, этычных і прававых межаў свабоды інтэрнэту. «Я так свабодна кажу пра пытанні інтэрнэту, таму што ніхто з вас мяне не папракне ў тым, што мы хоцьбы ў нечым абмяжоўваем інтэрнэт у Беларусі, — заўважыў Лукашэнка. — Хоць трэба было б, але мы яшчэ не ведаем, як гэта зрабіць так, каб цывілізаванае грамадства зноў не падвергла нас санкцыям. Таму мы пакуль не чапаем інтэрнэт. Час церпіць. Паглядзіце на іншыя краіны: як яны разбіраюцца з інтэрнэтам. Гэта яшчэ адна праблема правоў чалавека».

Па гэтым пытанні пазіцыя Беларусі выкладзена ў прынятай нядаўна нацыянальнай Канцэпцыі інфармацыйнай бяспекі.

Але і ў гэтай тэме, падкрэсліў беларускі лідар, без распрацоўкі агульных правілаў, якія прызнаюць усе ўдзельнікі міжнароднай супольнасці, немагчыма дасягнуць жаданых вынікаў па абароне грамадзян.

«Я быў бы рады, калі б сёння з Мінска мы запусцілі «хвалю лічбавай бяспекі», прызваную ўмацаваць сувязі паміж краінамі, павысіць эфектыўнасць сумеснага процідзеяння тэрарыстычным і іншым пагрозам у кіберпрасторы», — адзначыў Прэзідэнт Беларусі.

### Побач з нашымі межамі

У кантэксце тэмы канферэнцыі Аляксандр Лукашэнка закрануў небяспеку, якую нараджае любы канфлікт, у тым ліку і ў суседняй з Беларуссю, і блізкай ёй Украіне. «Усе пакутуем з-за канфлікту ва Украіне. Вялікая праблема для мяне ў асабістым плане як кіраўніка дзяржавы-суседа — Украіна. Калі пачаўся гэты канфлікт, адзін высокапастаўлены чыноўнік пацікавіўся меркаваннем Беларусі», — успомніў беларускі лідар.

Тады Беларусь прапанавала план канкрэтных дзеянняў з гарантыямі і з асноўнай нагрузкай на Беларусь. Прэзідэнт сумленна папярэдзіў: у выпадку непрыняцця плана будзе вымушаны лічыць, што Еўропа не хоча, каб канфлікт вырашыўся. «Чаму не спынілі канфлікт дагэтуль — пяць гадоў амаль прайшло? Таму што гэта камусьці трэба», — лічыць беларускі лідар.

Ён заклікаў шчыра пагаварыць на гэтую тэму, памятаючы пра адкрытую, шчырую, сумленную палітыку Мінска. Прэзідэнт расказаў, што ў пачатку гэтай трагічнай гісторыі ўнутры Беларусі яго многія папракалі: навошта ўлазіць у чужы канфлікт.

«Я адказаў: па-першае, гэта родныя людзі, нас сутыкнулі там ілбамі, а па-другое, гэта побач з намі. І што мы атрымалі? Чаго я баяўся: вялізны прыток мігрантаў... Першы год 150 тысяч прыбыло да нас, — паведаміў Прэзідэнт. — Еўрапейцы дзве тысячы мігрантаў не могуць падзяліць. У дэмакратычнай Еўропе ў моры боўтаюцца дзеці, старыя, якія бягуць ад праблем, іх ніхто не хоча прымаць. Дзве тысячы. А да нас 150 тысяч хлынула. Не чужых для нас людзей. І літаральна праз некалькі дзён я падпісаў указ аб даванні ім роўных магчымасцяў у Беларусі: па жыллі, па адукацыі, па ўладкаванні дзяцей у садкі, па працаўладкаванні дарослых. Нам страшна было прымаць гэтыя 150 тысяч, для нашай Беларусі з нашымі праблемамі. Вы думаеце, нам нехта дапамог? Не. Ды мы і не прасілі гэтай дапамогі».

Але самае страшнае, што адбылося потым, і зараз працягваецца, дадаў кіраўнік дзяржавы. «Мы вымушаныя былі са сваімі братамі, блізкімі людзьмі цалкам закрыць межы. Закрыць мяжу наглуха, яшчэ больш, чым з Паўночнаатлантычным блокам, які для нас заўсёды, з даўніх часоў быццам бы здаваўся ворагам нумар адзін. А сёння са сваім сябрам закрылі мяжу наглуха. Чаму? Хлынула плынь зброі. А там, дзе зброя ў руках у звычайных людзей, у людзей, як вы кажаце, нацыяналістычна настроеных, чакай тэрарызму. І спакойная Беларусь, не дай бог, можа пажынаць гэтыя плады і атрымаць тое, для чаго ў нас няма быццам бы падстаў», — з горыччу сказаў Аляксандр Лукашэнка.

### Не толькі тэрарызм

Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу, што процідзеянне тэрарызму — выключна важнае, але не адзінае звяно ў ланцугу ўсеагульных намаганняў па забеспячэнні міжнароднай бяспекі. Сёння мы з'яўляемся сведкамі дэградацыі сістэмных асноў гэтай міжнароднай бяспекі, якія ствараліся з сярэдзіны мінулага стагоддзя, сказаў ён. Адной з прычын гэтага працэсу стала разбурэнне даверу паміж краінамі.

Апошні сумны прыклад — спыненне дзеяння Дагавора аб ліквідацыі ракет сярэдняй і меншай далёкасці.

«І вы, напэўна, разумееце, што праз некалькі гадоў мы пачнём змагацца супраць гэтага страшнага зла, траціць грошы, праводзіць канферэнцыі. І тыя, хто сёння вінаватыя ў парушэнні гэтых дагавораў, яны, магчыма, будуць ініцыятарамі гэтых канферэнцый», — заўважыў кіраўнік дзяржавы.

Дык ці не лепш зараз спыніцца, задаў ён рытарычнае пытанне. Праблема, якую нараджае выхад краін-удзельніц з названага дагавора, ужо праз пару гадоў заслоніць праблему тэрарызму, папярэдзіў Аляксандр Лукашэнка. «Калі мы не спынімся, лічыце, што мы зрабілі першы крок да новай вайны. І дай бог, каб гэта вайна хоць бы абышлася без ядзернай зброі», — папярэдзіў ён.

### Зноў будаваць давер

Для аднаўлення даверу Беларусь паслядоўна і настойліва прасоўвае ідэю аб неабходнасці аднаўлення шырокага міжнароднага дыялогу — як на рэгіянальным, так і на глабальным узроўні. «Без усеагульнай гатоўнасці да новага перагаворнага працэсу, які б стабілізаваў міжнародныя адносіны, мы не можам гарантаваць бяспеку ўсім сваім краінам і народам», — акцэнтаваў кіраўнік дзяржавы.

Неабходны пошук аб'яднальнага парадку дня, новых ідэй, якія падзяляюцца шырокім колам дзяржаў і міжнародных арганізацый. Адной з іх, на думку Аляксандра Лукашэнкі, павінна стаць супрацьдзеянне размяшчэнню ракет сярэдняй і меншай далёкасці ў Еўрапейскім рэгіёне.

Беларусь прапаноўвала абмяркаваць праблему ў фармаце перамоўнага працэсу Хельсінкі II. «Мы прапанавалі не толькі публічна. Я асабіста прапаноўваў у закрытым рэжыме стварэнне перагаворнага працэсу Хельсінкі II. Казаў: мы не прэтэндуем на тое, каб быць ініцыятарам. Няхай Дональд Трамп, Ангела Меркель, Уладзімір Пуцін, Сі Цзіньпін і іншыя выступяць ініцыятарамі. Можа, іх пачуюць. Потым сказалі пра гэта адкрыта. І ведаеце, прасунутыя палітыкі Еўропы (не называю прозвішчы) мне сказалі: «Спадар Прэзідэнт, трэба зняць гэту праблему», — расказаў Аляксандр Лукашэнка.

Прэзідэнт катэгарычна не згодны з такой пазіцыяй замоўчвання вострых праблем. Значыць, некаму выгадна рашэнне іх не патрэбна, а нехта не ведае, што на гэта адказаць, выказаў ён здагадку. «Але не толькі яны вырашаюць лёс на нашай планеце — гэтыя вялікія, — справядліва заўважыў кіраўнік Беларусі. — Сярэднія і малыя дзяржаў больш, і яны маюць свой голас. Калі яны (вялікія) не хочуць, давайце мы будзем збірацца і гаварыць пра гэта, абмяркоўваць гэтыя праблемы».

Аляксандр Лукашэнка заявіў: «З гэтай трыбуны зноў паўтару, што Беларусь з'яўляецца паўнапраўнай удзельніцай Дагавора аб ліквідацыі ракет сярэдняй і меншай далёкасці. Мы не выходзілі з яго, і не маем намеру вырабляць або размяшчаць такія ракеты, калі яны не будуць пагражаць нашай бяспецы. Пакуль такой сітуацыі няма, спадзяюся, што не будзе».

Прэзідэнт выказаў упэўненасць, што сумесныя дзеянні па захаванні дасягненняў Дагавора аб ракетах сярэдняй і меншай далёкасці на нашым кантыненце сталі б важным крокам ў глабальным дыялогу па аднаўленні даверу.

«Вельмі багатыя краіны кажуць: у нас шмат грошай, таму ў гонцы ўзбраенняў мы выйграем. Павярхоўныя, неразумныя заявы. Сёння тэхналогіі настолькі развітыя, што не абавязкова ў гонцы ўзбраенняў быць першым, не абавязкова некага дагнаць, перагнаць. Сёння нават краіна з сярэднім дастаткам можа вырабіць такую зброю, што тым, хто жадае быць лідарам, мала не падасца. Многія працэсы патрабуюць пераасэнсавання перш за ўсё з нашага боку», — сказаў напрыканцы Аляксандр Лукашэнка.

Прэзідэнт Беларусі дадаў, што ўсё сказанае ім — вынік вялізнага палітычнага вопыту, які ён назапасіў за 25 гадоў прэзідэнцтва. «Я як чалавек і як кіраўнік дзяржавы заклікаю вас задумацца над прынцыповымі пытаннямі, якія прагучалі ў маім выступленні», — падсумаваў ён.

***

На сесіі адкрыцця Міжнароднай канферэнцыі намеснік Генеральнага сакратара ААН, кіраўнік Контртэрарыстычнага ўпраўлення ААН Уладзімір Варанкоў перадаў удзельнікам пажаданні плённай работы і поспехаў ад Генеральнага сакратара Антоніу Гутэрыша. Намеснік генсека паведаміў, што рашэнні чацвёртай, мінскай канферэнцыі будуць выкарыстаны пры падрыхтоўцы другой канферэнцыі высокага ўзроўню кіраўнікоў контртэрарыстычных устаноў дзяржаў — членаў ААН, якая адбудзецца ў Нью-Ёрку ў чэрвені наступнага года.

Генеральны сакратар АБСЕ Томас Грэмінгер адзначыў, што нельга абмяжоўваць увагу толькі тэмай зламыснага выкарыстання сучасных тэхналогій тэрарыстычнымі арганізацыямі, — трэба навучыцца самім выкарыстоўваць іх больш актыўна.

Старшыня Выканаўчага камітэта — Выканаўчы сакратар СНД Сяргей Лебедзеў у сваю чаргу падкрэсліў асобую ролю Беларусі як дзяржавы, якая выступае за мірнае рашэнне міжнародных канфліктаў і дае зручную пляцоўку для перагавораў і міжнародных форумаў.

**Варвара МАРОЗАВА,**
**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.**

# «Друкарскі зубр» едзе ў Маскву

**4 верасня пачынае сваю работу 32-я Маскоўская міжнародная кніжная выстаўка-кірмаш, ганаровым госцем якой сёлета будзе Беларусь. Айчынныя выдаўцы прадставяць на форуме мноства цікавых праектаў, запросяць у госці вядомых беларускіх касманаўтаў і спартсменаў, а таксама прывязуць на выстаўку... зубра.**

Плошча беларускага нацыянальнага стэнда на ВДНГ складае 222 квадратныя метры і будзе шчыльна запоўненая не толькі ўласна кнігамі, але і іншымі цікавымі падзеямі і праектамі. «У нас будзе прэзентацыйная частка, будзе кніжная экспазіцыя са штодзённым абнаўленнем, месца для работы з аўтарамі, гандлёвая пляцоўка ад «Белкнігі», — расказаў **намеснік міністра інфармацыі Беларусі Ігар БУЗОЎСКІ.**

Кожны з пяці дзён выстаўкі, расказала **дырэктар выдавецтва «Народная асвета» Вікторыя КАЛІСТРАТАВА,** мае канкрэтны тэматычны кірунак і напаўненне. Так, першы дзень пад умоўнай назвай «Усе госці ў дом» прадставіць міжнародныя кніжныя праекты, у тым ліку сумесны беларуска-расійскі літаратурны праект «Сугучча», у якім беларуская паэзія прагучыць на мовах народаў Расіі, а сусветна вядомыя і сучасныя расійскія вершы будуць чытацца ў перакладзе на беларускую. Другі дзень прысвечаны 75-годдзю вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў: шырокая аўдыторыя пазнаёміцца на беларускім стэндзе з кніжнай серыяй «Беларусь. Трагедыя і праўда памяці», якая стала пераможцам міжнароднага конкурсу «Мастацтва кнігі краін СНД» у намінацыі «Перамога», а кніга пра Хатынь разышлася настолькі хутка, што спатрэбілася выпускаць дадатковы тыраж. Дзень трэці будзе прысвечаны тэме малой радзімы і расказа пра турыстычны патэнцыял нашай краіны — іміджавыя выданні і праекты па гісторыі нацыянальных касцюмаў, кухні, рамёстваў, традыцый прэзентуюць не толькі выдавецтвы, але таксама літаратурныя музеі Беларусі, замкавы комплекс «Мір», Нацыянальная і Прэзідэнцкая бібліятэкі. На чацвёрты дзень наведвальнікаў чакаюць сустрэчы з папулярнымі беларускімі аўтарамі, сярод якіх Наталля Батракова і Людміла Рублеўская; таксама на прэзентацыю кніжнай серыі «Асобы» абяцаюць зазірнуць вядомыя касманаўты, а выданне пра гісторыю беларускага біятлону «ажывяць» некаторыя яго героі-спартсмены. Нарэшце, у заключны, пяты дзень выстаўкі беларускі стэнд будзе цалкам аддадзены чытачам і асалодзе чытання добрых кніг.

Сярод іншых знакавых выданняў, якія беларускія кніжнікі пакажуць на міжнародным маскоўскім форуме, — прэзентацыя праекта Уладзіміра Ліхадзедава «У пошуках страчанага», наўпрост звязанага з 25-годдзем інстытута прэзідэнцтва ў нашай краіне, — менавіта за гэты тэрмін убачылі свет 25 кніг, якія ілюструюць у старых паштоўках і рарытэтных фотаздымках даўнюю і сучасную гісторыю нашых гарадоў і мястэчак. Дапоўніць гэты праект адмысловы арт-аб'ект, які сімвалізуе вытокі беларускага і сусветнага пісьменства — скульптура «Друкарскага зубра», сабраная з дэталяў старых друкарскіх станкоў і шрыфту. А прыемным сюрпрызам для пакупнікоў беларускіх кніг стане магчымасць бясплатна наведаць інтэрактыўную экспазіцыю «Друкарскі двор XVI стагоддзя» і надрукаваць на дзеючым станку па старажытных тэхналогіях 1-ю старонку скарынаўскай Біблі... І гэта, падкрэсліваюць удзельнікі нашай дэлегацыі, далёка не ўсе запланаваныя цікавінкі.

Дарэчы, з улікам высокага чытацкага інтарэсу ўпершыню арганізатары ММКВК павялічылі час работы выстаўкі адразу на дзве гадзіны — з 10 да 20. Наогул удзел у сёлетнім форуме, як чакаецца, возьмуць выдавецтвы з больш як 25 краін свету.

**Вікторыя ЗАХАРАВА.**

## ЮНЫМ СУВОРАЎЦАМ УРУЧЫЛІ ПАГОНЫ

**У Мінскім суворaўскім ваенным вучылішчы адбылася цырымонія пасвячэння. Праз яе ў Дзень ведаў прайшлі 73 новаспечаныя першакурснікі. Яны атрымалі пунсовыя пагоны з рук колішніх навучэнцаў — усё згодна з даўняй традыцыяй.**



Фота БелТА.

— Гэты дзень вам запомніцца на ўсё жыццё, — сказаў **міністр абароны Беларусі Андрэй РАЎКОЎ.** — Гэта пачатак жыцця, станаўлення вас як мужчын, якое прывядзе вас да вышынь. Вы мусіце дакладна памятаць, што вучыцца заўжды цяжка. Напрыканцы гэтага шляху вы зробіце выбар — або і надалей звязваць сваё жыццё з арміяй, або стаць грамадзянскімі спецыялістамі. Але ва ўсякім разе тут дадуць вам адукацыю, якая адкрые перад вамі ўсе дарогі.

— Пагоны ўручаюць генералы — міністр абароны Андрэй Раўкоў, намеснік міністра абароны Сяргей Патапенка і іншыя колішнія выпускнікі Суворaўскага вучылішча, якія дамагліся значных прафесійных вышынь, — расказвае **начальнік навучальнай установы генерал-маёр Аляксандр НАВУМЕНКА.** — Першыя пагоны юным суворaўцам прышываюць навучэнцы выпускнога курса. Такім чынам яны дэманструюць узаемадапамогу.

У найбліжэйшы час іх чакае асваенне агульнаадукацыйнай праграмы. Але акцэнт будзе рабіцца на спецыяльную. Вялікую ўвагу нададуць стралковай падрыхтоўцы, плаванню. Адкрыўся і новы спартыўны гарадок.

Акрамя таго, з гэтага года суворaўцы змогуць наведваць Мінскі палац дзяцей і моладзі, каб мець такія ж магчымасці для ўсебаковага развіцця, як і іх равеснікі, якія вучацца ў звычайных школах. Мяркуецца, што яны будуць наведваць заняткі па робататэхніцы, авіямадэляванні, шахматах.

**Арцёму ЖУКАВУ** споўнілася 12. Хлопчык выглядае развіты не па гадах і трымаецца вельмі годна.

— Я сам родам з Мінска. У Суворaўскае вучылішча вырашыў паступаць, калі ўпершыню ўбачыў рэкламу. Пасля схадзіў на дзень адчыненых дзвярэй. І мне вельмі спадабалася! Мае бацька і дзед — лётчыкі, служылі ў паветрана-дэсантных войсках. Пра армейскае жыццё ведаю з маленства. Конкурс сёлета быў вялікі — восем чалавек на месца! Але падчас здачы іспытаў я не напружваўся. Трэба было прайсці выпрабаванні па беларускай і рускай мовах, матэматыцы і фізкультуры. Па ёй мы здавалі бег на паўтара кіламетра, шэсцьдзясят метраў і падцягванні. Тут мы знаходзімся ўжо тыдзень. За гэты час мяне навучылі прышываць падкаўнерык, крыху асвоіўся і са страявой падрыхтоўкай.

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.**

## Спорт-тайм

### ПЕРАМОГ ПАКУЛЬ НЯМА



**У стартавым паядынку 12-га па ліку чэмпіянату КХЛ хакеісты мінскага «Дынама» прымалі ў панядзелак ніжнекамскі «Нафтахімік».**

На першы матч новага сезона «Дынама» выйшла ў новай форме з новым лагатыпам. Перад пачаткам гульні прайшло яркае шоу, а ўсе гледачы «Мінск-Арэны» атрымалі ў падарунак майкі з новай эмблемай клуба. За стартавым матчам разам з гледачамі на трыбунах назіраў і Прэзідэнт краіны Аляксандр Лукашэнка.

Новая форма і атрыбутыка не дапамаглі «Дынама», першая гульня чэмпіянату завяршылася для іх паражэннем з лікам 2:4, у гаспадароў вызначыліся Тэму Пулкінен і Марк-Андрэ Граньяні. Наступныя матчы мінскія дынамаўцы правядуць на выездзе: сёння — з маскоўскімі аднаклубнікамі, 6 верасня з «Сочы» і 8-га — са «Спартаком».

### ТРЫ БЕЛАРУСКІ ЗГУЛЯЮЦЬ У 1/4 US OPEN

**Тры прымы беларускага тэніса выбылі з адзіночнага розыгрышу на US Open, але ўсе згуляюць там жа ў парных сустрэчах.**

У першым крузе Арына Сабаленка абыграла Вікторыю Азаранку, але ў другім саступіла прадстаўніцы Казахстана Юліі Пуцінцавай. Дарэчы, пасля гэтага матча расіянін Дзмітрый Турсунаў абвясціў, што больш не з'яўляецца асабістым трэнерам нашай суайчынніцы. Аляксандра Сасновіч у трэцім раўндзе адкрытага чэмпіянату ЗША прайграла тэнісістцы з Туніса Унс Джабір. Але ўсе тры беларускі згуляюць у 1/4 фіналу: Азаранка і аўстралійка Эшлі Барці, Сабаленка і бельгійка Эліс Мертэнс, Сасновіч і славачка Вікторыя Кужмава ў парных сустрэчах пераадолелі сіта аднай восьмай.

**Іван КУПАРВАС.**

## ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### Расія асудзіла заяву Джонсана пра Другую сусветную вайну



Пасольства Расіі ў Лондане назвала непрымальнымі словы брытанскага прэм'ер-міністра Барыса Джонсана, які параўнаў дзеянні СССР у Польшчы з агрэсіяй Трэцяга рэйха.

Напярэдадні Джонсан выступіў з відэазваротам, у якім расказаў, што ў пачатку Другой сусветнай у верасні 1939 года Польшча апынулася паміж «фашысцкім молатам і камуністычным кавадлам».

«Гэтая заява Джонсана выклікае здзіўленне. Пры ўсіх гістарычных дыскусіях вакол савецкай ваеннай аперацыі ва ўсходніх раёнах Польшчы (у Заходняй Украіне і Заходняй Беларусі) пастаноўка пытання, пры якой дзеянні СССР фактычна прыраўноўваюцца да гітлераўскай агрэсіі, цалкам непрымальная», — прыводзіць адказ расійскіх дыпламатаў ТАСС.

Пасольства РФ згадала, што калі хто і асудзіў Польшчу на трагедыю, акрамя Гітлера, дык гэта брытанская дыпламатыя, якая заплюшчвала вочы на захопніцкую палітыку нацыстаў і сабатавала прапановы СССР аб стварэнні антыгітлераўскага альянсу, у тым ліку для абароны Польшчы.

### Прэзідэнт Чэхіі павіншаваў прэм'ера краіны са спыненнем судовай справы супраць яго

Кіраўнік Чэхіі Мілаш Земан павіншаваў прэм'ер-міністра рэспублікі, доларавага мільярдэра Андрэя Бабіша, якому споўнілася 65 гадоў, з днём нараджэння і... спыненнем расследавання крымінальнай справы, распачатай супраць яго паліцыяй. Пра гэта інфармавала чэшскае тэлебачанне.

Мясцовыя СМІ паведамілі, што пракурор Яраслаў Шарах, які займаўся справай прэм'ера, спыніў расследаванне, якое вялося на працягу апошніх чатырох гадоў. Адначасова яно было спынена ў дачыненні да сваякоў і блізкіх паплечнікаў Бабіша, што таксама праходзілі па гэтай справе.

Паліцыя вінаваціла Бабіша ў махінацыях з фінансавымі датацыямі з фондаў Еўрасаюза. Яму ставілі ў віну арганізацыю схемы незаконнага прысваення ў 2010 годзе 50 млн крон (каля €2 млн) яго кампаніяй «Гняздо бусла».

Між тым законнасць рашэння Шараха яшчэ павінны пацвердзіць пракуратура Прагі і, магчыма, Генеральная пракуратура Чэхіі.

### Дзейнасць чалавека ўплывала на планету ўжо ў 2000 годзе да нашай эры



Дзейнасць чалавека пачала мяняць нашу планету і яе клімат на чатыры тысячы гадоў раней, чым думалі вучоныя. Да такой высновы прыйшлі даследчыкі з універсітэта Квінслэнда ў Брысбене, якія апублікавалі сваю справаздачу ў часопісе Science.

На працягу доўгага часу «мы значна недаацэньвалі ўздзеянне старажытных цывілізацый на экасістэму Зямлі», сцвярджаюць антраполагі, якія ўдзельнічалі ў шырокамаштабным даследчым праекце, накіраваным на ацэнку ступені ўплыву дзейнасці людзей на планету.

«Вядома, сучасныя тэмпы і маштабы антрапагенных глабальных змен нашмат большыя, чым у далёкім мінулым, але доўгатэрміновае кумулятыўнае ўздзеянне, якое старажытныя земляробы і жывёлагадоўцы аказвалі на Зямлю, значна больш сур'ёзнае, чым мы раней меркавалі», — сказала доктар Андрэа Кей з аддзялення сацыяльных навук універсітэта Квінслэнда. Паводле яе слоў, выкліканыя чалавекам змены глебавага покрыва пачаліся не ў сярэдзіне XX стагоддзя, а былі дастаткова шырокія ўжо ў 2000 годзе да нашай эры. «У нас была планета, ужо тады ў значнай ступені змененая старажытнымі палянічымі, збіральнікамі, фермерамі і жывёлагадоўцамі», адзначыла доктар Кей.


**Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»**

**извещает о проведении повторного аукциона**

ЛОТ 1: капитальное строение, инв. № 440/С-12972 (назначение – здание специализированное розничной торговли, наименование – рыночный павильон – 1) обшей площадью 91,3 кв. м, расположенное по адресу: г. Ошмяны, ул. Советская, 135; капитальное строение, инв. № 440/С-12973 (назначение – здание специализированное розничной торговли, наименование – рыночный павильон – 2) обшей площадью 44,1 кв. м, расположенное по адресу: г. Ошмяны, ул. Советская, 135/1; капитальное строение, инв. № 440/С-12974 (назначение – здание специализированное розничной торговли, наименование – рыночный павильон – 3) обшей площадью 32,4 кв. м, расположенное по адресу: г. Ошмяны, ул. Советская, 135/2.

Лот № 1 расположен на земельном участке, кадастровый № 424950100001002618 площадью 0,2097 га (назначение – земельный участок для размещения объектов розничной торговли), расположенном по адресу: г. Ошмяны, ул. Советская.

Начальная цена продажи – 108 000 р. (сто восемь тысяч рублей) с учетом НДС. Сумма задатка – 5 400 р. (пять тысяч четыреста рублей).

Продавец – Ошмянский филиал Гродненского областного потребительского общества, 231103, г. Ошмяны, ул. Советская, 130, тел. 8-01593-76-705.

Организатор торгов – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел. 41-98-32, 45-05-38.

Условия аукциона – без условий. Условия оплаты – по договоренности сторон. Срок заключения договора купли-продажи – не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукционных торгов.

Номер р/с для перечисления задатка – BY44BLBB30120500833225001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка BLBBBY2X, УНП 500833225.

**Аукцион состоится 17 сентября 2019 г. в 11.00 по адресу: Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3-209**

Порядок регистрации в качестве участника аукциона и правила проведения аукциона содержатся на сайте организатора аукциона: http://grodnoino.by/aukcion/uchastniku.

Объявление о проведении первого аукциона было размещено в газете «Звязда» от 08.05.2019 г.

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 209, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница). Обед с 12.30 до 13.18.**

**Последний день приема заявлений – 13 сентября 2019 г. до 15.00.**

*Телефоны для справок: 45-05-38, 41-98-32– Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» http://grodnoino.by*


**Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь выказвае глыбокія спачуванні Віктару Андрэевічу Лісковічу, намесніку старшыні Гродзенскага абласнога выканаўчага камітэта, у сувязі з напаткаўшым яго вялікім горам — смерцю БАЦЬКІ.**

**Выдавецкі дом «Звязда» выказвае шчырыя спачуванні намесніку старшыні Гродзенскага абласнога выканаўчага камітэта Віктару Андрэевічу Лісковічу ў сувязі з напаткаўшым яго вялікім горам — смерцю БАЦЬКІ.**

# ГРЭЦЦА І НЕ ЗАГАРЭЦЦА



Фота mchs.gov.by.

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Коміны, як правіла, з гліняных цаглін робяць таўшчынёй не менш за 12 сантыметраў. Але нярэдкія выпадкі, калі гэтая ўмова парушаецца і выкарыстоўваюцца забароненыя металічныя, керамічныя і асбестацэментныя трубы. Паветраны прамежак паміж печчу і гаручымі сценамі павінен складаць 20—50 сантыметраў у залежнасці ад абароненасці гаручай сцяны, таўшчыні сцены печы.

Асноўнае месца, у якім можа адбыцца ўзгаранне, — дзе комін праходзіць праз драўлянае паддахавае ці міжпавярховае перакрыцце і дах, пакладзены з ужываннем згаральных матэрыялаў. Таму адлегласць ад унутранай паверхні коміна да гаручых канструкцый перакрыцця павінна быць не менш за 380 міліметраў, калі канструкцыі неабаронены, і не менш за 250 міліметраў у выпадку абароненых. Ад вонкавай паверхні коміна да гаручых канструкцый даху належная мець не менш за 130 міліметраў. Перад топкай павінен быць прыбіты металічны ліст памерам не менш за 50 на 70 сантыметраў.

## Калі ад прыбора лепш пазбавіцца

Самаробныя абагравальнікі і цяпер трапляюць у зводкі аб пажарах. Хоць такіх выпадкаў стала значна меней — дэфіцыту электрычных ацяпляльных прыбораў у крамах гаспадарчых тавараў няма ўжо даволі даўно, ды і цэны на іх не заблачныя. Але не ўсё так проста ў абодвух выпадках.

У студзені ў вёсцы Малая Падзер Слуцкага раёна знутры загарэўся жылы драўляны дом. Унутры знаходзіўся гаспадар. Яго і вынеслі на свежае паветра ратаўнікі. Пазней мужчыну даставілі ў цэнтральную раённую бальніцу з апёкамі і атручэннем чадным газам. Ад самога дома мала што засталося — агонь моцна пашкодзіў драўляныя перакрыцці, дах і сцены па ўсім перыметры. А прычынай гэтых няшчасцяў стаў самаробны ацяпляльнік. Дзень тады выдаўся даволі марозны — тэмпература не падымалася вышэй за мінус 8 градусаў.

— Аднак куды часцей мы сутыкаемся з інцыдэнтамі, якія звязаныя з выкарыстаннем электрычных абагравальнікаў, зробленых у самых што ні на ёсць заводскіх умовах. І амаль усе яны звязаны з парушэннем правіл эксплуатацыі. Напрыклад, хтосьці вырашыў як мага хутчэй прасушыць вопратку пасля дажджу, паклаў яе на рашотку канвектара — а яна пачала імкліва награвацца, пасля тлець і ў нейкі момант успыхнула полымя... Апошнім часам нарастае негатыўная тэндэнцыя, калі вогненны «сюрпрыз» ладзяць тыя абагравальнікі, якія адпрацавалі больш за ўстаноўлены тэрмін эксплуатацыі.

Вытворцамі кіруе не столькі філантропія, колькі маркетынг. Па-першае, рабіць апараты, якія будуць працаваць адно-два дзесяцігоддзі без паломак, не вельмі выгадна ў доўгатэрміновай перспектыве — калі рынак будзе насычаны цалкам, то куды і каму збываць новыя агрэгаты? А з гэтага вынікае другое — тэрмін эксплуатацыі трэба змяншаць. Унутр апарата ставяцца драты з меншым дыяметрам сячэння, вельмі трывалыя матэрыялы замяняюцца на аналагі, якія зроблены, як кажуць, не «на стагоддзі». Пакупнік жа ў кароткатэрміновай перспектыве, калі стаіць задача тут і зараз набыць абагравальнік, выйграе. Апарат робіцца больш прывабным па цане. Але за гэта таксама трэба будзе плаціць.

— Раней электрычныя абагравальнікі маглі працаваць па 10—15 гадоў. Такі тэрмін службы закладваў у пашпарце завод-вытворца. Цяпер жа мы не раз сутыкаліся з тым, што тэхніка па пашпарце разлічваецца ўсяго на пяць-сем гадоў. Вядома, гэта не азначае таго, што роўна ва «ўзросце» сем гадоў і адзін дзень пасля набыцця прыбор не ўключыцца. Хутчэй за ўсё, ён запрацуе, проста вытворца не будзе несці ніякай адказнасці за далейшы лёс гэтага апарата, нават калі ён ні разу не быў у рамонце і на ім захаваліся ўсе заводскія пломбы.

Спажыванне ў электрычнага ацяпляльніка даволі высокае. Таму яго нельга ўключаць разам з іншымі прыборамі. Напрыклад, толькі ў Мінску за першыя тры месяцы гэтага года адбылося 20 узгаранняў, звязаных з перагрузкай электрасетак, або з пакінутымі без нагляду электрапрыборамі, уключанымі ў сетку. Аднак пры кароткім замыканні ў ідэале мусіць спрацаваць засцерагальнік, але спадзявацца толькі на яго не варта.

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.**

# Запрашае «Энергія ўзросту»

**Як быць шчаслівым, калі выйдзеш на пенсію? Адказ на гэтае пытанне шукайце на фестывалі «Энергія ўзросту», які адбудзецца пад Мінскам 5–7 верасня. На яго запрашаюцца ўсе, хто пасля 50 не баіцца зноўку знаходзіць сябе, вучыцца і рэалізоўваць свае мары.**

У праграме фестывалю — прэзентацыі адукацыйных праектаў і праграм для людзей старэйшага ўзросту; правядзенне калектыўных спартыўных спаборніцтваў, конкурсаў выканаўчага майстэрства па спевах, танцах і іншых відах творчасці; абмен вопытам па пытаннях актыўнага даўгалецця; майстар-класы і дыскусіі; сустрэчы з патэнцыйнымі партнёрамі для сумеснай рэалізацыі ініцыятыў і многае іншае.

Фестываль збярэ разам удзельнікаў з Беларусі, а таксама калег з еўрапейскіх і постсавецкіх краін, таму афіцыйнымі мовамі мерапрыемства будуць руская, беларуская і англійская. Падчас фестывалю таксама будзе забяспечаны пераклад.

«Энергія ўзросту» абяцае стаць сапраўдным святам, унікальным месцам зносін і абменам досведам. Тут можна будзе разам вучыцца, весяліцца, спяваць і танцаваць, знаходзіць новых сяброў.



Сярод арганізатараў — Грамадская арганізацыя «Беларуская асацыяцыя сацыяльных работнікаў». Яна мае 23-гадовы досвед работы ў сацыяльнай сферы Беларусі і за гэты час рэалізавала больш за 40 паспяховых сацыяльных праграм і праектаў, адным з якіх з 2013 года з'яўляецца праект «Мінскі ўніверсітэт трэцяга ўзросту». Яшчэ адзін арганізатар — турыстычная кампанія «Бенефіс-Тур» — першая на беларускім рынку турыстычных паслуг, якая прафесійна займаецца развіццём турыстычных напрамкаў для людзей старэйшага ўзросту.

Фестываль будзе праходзіць на базе адпачынку «Галактыка».

Туды: кожныя 30 хвілін з 08.00 да 10.30 будуць ад'язджаць аўтобусы ад станцыі метро «Каменная горка» (прыпынак на выезд з горада, другі навес). Білет у абодва бакі набываецца ў валанцёраў каля аўтобуса. Цана 5 рублёў.

Назад: кожныя 30 хвілін з 17.00 да 19.00 аўтобусы з фестывалю ад'язджаюць ад базы адпачынку «Галактыка».

Уваходны білет: адзін дзень — 5 рублёў (набываецца на месцы).

**Святлана БУСЬКО.**


Центр Промышленной Оценки

• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

**Извещение о проведении повторного аукциона**

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703 |
| **Продавец** | ОАО «Паритетбанк», г. Минск, ул. Киселева, 61а |

**Предмет аукциона:**
Изолированное помещение №1 (1-2-й этаж) (административное помещение), инв. номер 100/D-73862, общ. пл. 173,8 кв. м, Брестская обл., г. Брест, ул. Задворская, 4

| | |
|---|---|
| **Начальная цена с НДС 20 %** | 66 910,81 белорусского рубля (снижение 50 %) |

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях (BYN) перечисляется на счет BY60BLBB30120191021390001001; нерезидентами РБ задаток может перечисляться в валютном эквиваленте по курсу Нацбанка РБ на дату платежа на счет: в долларах США (USD) – BY76BLBB30120191021390001004 в евро (EUR) – BY33BLBB30120191021390001002; в российских рублях (RUB) – BY22BLBB30120191021390001006 в Дирекции «ОАО Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки», УНП 191021390.

| | |
|---|---|
| **Срок подписания договора купли-продажи:** | 10 рабочих дней после проведения аукциона |

**Условия оплаты предмета аукциона:** в течение 30 (тридцати) календарных дней после заключения договора купли-продажи.

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.cpo.by

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия.

Предыдущее извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» 16.08.2019 г.

| | |
|---|---|
| **Дата и время проведения аукциона** | **17.09.2019 в 13.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки».** |
| **Дата и время окончания приема документов** | **16.09.2019 до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки».** |
| **Контактные телефоны** | **+375 17-280-36-37; +375 29-317-95-42. E-mail: auction@cpo.by** |


# Збілі жанчыну, запхнулі ў машыну...

**Учора ўвечары ў аператыўна-дзяжурную службу Савецкага РАУС Гомеля паступіла паведамленне ад жыхароў дома на вуліцы Быхаўскай. Яны паведамілі, што невядомыя збілі жанчыну, запіхнулі яе ў аўтамашыну маркі БМВ белага колеру і з'ехалі ў невядомым напрамку. Гэтую інфармацыю перадалі ў міліцэйскі эфір. На вышук аўтамабіля былі арыентаваны ўсе мабільныя і пешыя нарады органаў унутраных спраў абласнога цэнтра.**

**Штогод — і не толькі ў дзень Перамогі — на нашы партызанскія могілкі прыязджаюць нашчадкі тых, хто загінуў у гады апошняй вайны, хто знайшоў свой вечны спачын на гэтым узлеску. Сярод іх — і мая прабабуля Марта Рыгораўна Міхалік. Яе не стала ў 1976 годзе, але «пахавацца» яна хацела іменна тут, побач з сябрамі-партызанамі.**

Як і ўсе жанчыны, што жылі ў вёсках сярод лясоў, бабуля чым магла дапамагала народным мсціўцам: пякла хлеб, мыла бялізну, здабывала звесткі пра ворага... Я запомніла яе працавітай, рухавай і бясконца добрай. Яна заўсёды хадзіла ў доўгай — аж па пяты — спадніцы. Пашыла яе мая мама — з саматканай тканіны і з мноствам, як мне здавалася, розных кішэнек і кішэняў. А ўжо там чаго толькі не было!

Нас, дзяцей, вядома ж, найболей цікавілі ласункі. Як зачараваныя мы сачылі за рукамі бабулі, калі яна даставала з кішэні хусцінку з гасцінцамі. У дзяцінстве нас не дужа песцілі смачненькім: мы рады былі не тое што цукерцы, нават драбку звычайнага цукру.

Але ж бабулю Марту мы любілі не толькі за яе прысмакі. Яна ведала мноства цікавых гісторый і казак. А як умела расказваць!..

На жаль, я не здагадалася хоць нешта запісаць. Спачатку, што называецца, дзіцячы быў розум, а калі крыху падрасла і паразумнела, прабабулі не стала. Відаць, таму на ўзвышшы, дзе пахаваны партызаны, мяне заўсёды ахутвае невыказны смутак і боль.

* * *

А маці мая, Сцепаніда Пятроўна Сліж, 9 мая заўжды ўспамінае той дзень, калі вайна пачалася. Яна, тады 14-гадовая дзяўчынка, вярталася з суседняй вёскі Вострава. Хадзіла туды, каб адправіць ліст свайму бацьку, якога забралі на вайсковыя зборы, і на паўдарозе пачула гул самалётаў, убачыла на крылах чорныя крыжы. Іх было вельмі шмат: здавалася, што паўнеба сабой засланілі, ад чаго ў сэрцы «пасяліўся» страх, які не пакідаў матулю аж да канца вайны...

Варожыя самалёты ляцелі тады ў бок Слоніма. Потым частка іх аддзялілася і скіравала да моста, які злучаў берагі Шчары. Выбухі скаланулі ўсю ваколіцу. «Як прыбегла дахаты — не помню», — расказвае маці.

Праз некалькі дзён праз вёску сталі ісці нашы салдаты — яны адступалі. А немцы наадварот — наступалі. У Гальцы яны размясцілі свой гарнізон, у іншых навакольных вёскі прыязджалі ў асноўным «шакаліць» — папаўняць запасы харчоў.

Рабілася гэта, вядома ж, смела, нахабна, пакуль у лесе не з'явіліся партызаны з ліку мясцовых юнакоў і мужчын, часам — вайскоўцаў, якія не змаглі выйсці з акружэння. Такім чынам у акрузе стала дзейнічаць партызанская група, якая з часам ператварылася ў партызанскі атрад і нават у брыгаду «Перамога», што дзейнічала на тэрыторыі цяперашніх Мастоўскага, Дзятлаўскага і Зэльвенскага раёнаў. Узначальваў яе ўдзельнік рэвалюцыйнага руху ў Заходняй Беларусі Павел Іванавіч Булак.

На ўскрайку лесу партызаны трымалі пост, а таму фашысты не маглі больш незаўважна пранікнуць у лясную зону. Некалькі разоў яны рабілі аблавы, каб знішчыць народных мсціўцаў, але тыя прымалі баі, папярэджвалі пра небяспеку мірных жыхароў. Вяскоўцы паспявалі схавацца — хто ў партызанскім лагеры, хто ў балоце, хто на востраве пасярэдзіне Шчары, дзе была землянка. Гэты востраў, дарэчы, і сёння ёсць — невялікі, прыгожы, густа зарослы хмызняком.

* * *

Успамінае мама і трагедыю, што адбылася якраз на Макавея. У гэты дзень у вёсцы Вострава фашысты пахапалі юнакоў, пагналі ў Дзярэчын... Як расказваў потым відавочца, іх, дваццаць чалавек, паставілі ў шарэнгу каля выкапанай ямы. Яны разумелі, для чаго... Юнак, што стаяў з краю, вырашыў бегчы, бо ўсё роўна, мауляў, застрэляць, і сігануў у блізкае жыта. Бег зігзагамі, кулі свісталі побач, але, на шчасце, ніводная з іх нават не зачапіла. «Гэта божае выратаванне», — гаворыць мама пра свайго земляка.

* * *

Любіць яна ўспамінаць і сустрэчу былых партызан, што адбылася ў канцы шасцідзясятых гадоў мінулага стагоддзя ля ракі, пад разгалістым дубам, дзе ў гады вайны была пераправа.

Людзей тады сабралася шмат і зблізку, і здалёку. У партызанскім атрадзе пасля разгрому нямецкага гарнізона апынуўся француз па імені Ліён. Ваяваў на роўных, разам з іншымі хадзіў на заданні...

На тую сустрэчу ён прыехаў са сваёй дачкой. Яна фатаграфавала баявых сяброў свайго бацькі, нашу хуткаплынную Шчару, статак кароў, што пасвіўся непадалёку...

Недзе, відаць, засталіся фотакарткі.

* * *

Помніць мама і час вызвалення.

Перад ім, расказала, немцы дужа лютавалі. Вяскоўцы хаваліся хто дзе мог. Маміна сям'я, прыхапіўшы тое, што трапіла пад руку, рушыла за рэчку, некалькі дзён прасядзела каля балота.

Аб тым, што можна вяртацца дамоў, здагадаліся па гуле машын — гэта была іншая, не нямецкая тэхніка.

Калі выйшлі на дарогу, заплакалі ад радасці, бо ўбачылі нашых салдат — з зоркамі на пілотках!

За калонай вайскоўцаў яны рушылі дахаты. А там... толькі папялішча ды ў садзе, пад яблынямі і вішнямі, што ўцалелі пасля пажару, — параненыя салдацікі.

Праз нейкі час па іх прыехала машына — павезла ў шпіталь.

...Штогод прыязджаюць на партызанскія могілкі блізкія тых, хто загінуў падчас вайны. Усё менш і менш сярод іх удзельнікаў яе і нават сведак. Але ж нам, нашчадкам, яны паспелі сказаць, што галоўны скарб на зямлі — гэта мірнае неба.

**Ірына Салата,**
*г. Гродна.*

Весткі з месцаў

## «І КОЖНЫ РАЗ У НАС МОРА СМЕХУ...»

**На двары было лета-лецейка, сонейка, нават, здаралася, спёка. Як схавацца ад яе, чым прыкрыць галаву? Аб гэтым — загадзя і досыць весела — гаварылі пенсіянеры клуба «Залаты ўзрост» на сваёй чарговай сустрэчы.**

Да яе, ну вядома ж, рыхтаваліся: шукалі патрэбную інфармацыю пра галаўныя ўборы, прыказкі ды прымаўкі, адказы на пытанні віктарыны, а потым — гулялі, танцавалі, шмат чаго дазналіся...

Гляджу цяпер на здымкі з той сустрэчы, якая так і называлася «Капялюшная вечарынка», і не веру, што ўдзельнікам (усе прыйшлі ў капелюшах!) каму за 70, а каму і за 80 гадоў. Залаты ўзрост!

Пенсіянеры аднайменнага клуба амаль кожны месяц збіраюцца на тэматычныя вечары, прысвечаныя то паэзіі, то Калядам, то кветкам, то Дню абаронцаў Айчыны, то розным напоям... І кожны раз гэта мора смеху, выдумкі і пазітыву.

Ідэя ды сама падрыхтоўка сустрэч належыць сёстрам Вользе і Таццяне Тукіным. Першыя памочнікі ў іх Ганна Лой, Лідзія Прыбалавец, Людміла Янучок з нязменным баянам. На жаль, я не ўсіх пакуль ведаю, але вельмі рада, што далучылася да гэтых цікавых, творчых людзей.

**Валянціна Гудачкова,** *г. Жыткавічы.*

Спявай, душа!

## Дзед паставіў сабе зубы...

*(Пенсіянерскія прыпеўкі)*

Бабка просіць дапамогі:
«Ой, не ходзяць мае ногі!
Жаніха знайдзі, унучка,
Каб насіў мяне
на ручках».

* * *

Як была я маладзіцай,
Хлопцы гужам —
не адбіцца.
А цяпер — не той анфас,
Упусціла, кажуць, час.

* * *

Наглядзеўся дзед
рэкламы
Пра заморскія Багамы.
І цяпер — «забіў» на ежу:
Не памру, пакуль
не з'езджу!

* * *

Плача дзед: «Прапалі дзеці,
Я адзін цяпер на свеце»...
Закалоў быў парсючка —
Сын знайшоўся і дачка!

* * *

Гаварыла баба дзеду:
«Я ў Амерыку паеду!»
Дзед смяецца са старэчы:
«Паспрабуйма злезці
з печы!»

* * *

Дзед паставіў сабе зубы,
Ходзіць — весяліцца.
Каб яшчэ й разжыцца
чубам —
Можна зноў жаніцца.

**Юлія Мішчук,**
*Маларыцкі раён.*


Центр Промышленной Оценки

• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

**Извещение о проведении повторного аукциона**

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703 |
| **Продавец** | ОАО «Белинвестбанк», г. Минск, пр-т Машерова, 29 |

**Предмет аукциона:**
**Торговое помещение,** общ. пл. 214,2 кв. м, инв. №130/D-4369, по адресу: Брестская обл., г. Пинск, ул. Советская, д. 2. Начальная цена с НДС 20 % – 183 600,00 бел. руб.
**Обременение:** договор аренды. Подробная информация на сайте WWW.CPO.BY

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета аукциона перечисляется на р/с BY60BLBB30120191021390001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

**Срок заключения договора купли-продажи:** 10 рабочих дней после проведения аукциона

**Ограничения (обременения) прав на недвижимое имущество,** установленные в связи с присвоением ему статуса памятника историко-культурного наследия. Новый собственник материальной историко-культурной ценности обязан в течение тридцати календарных дней со дня приобретения права собственности подписать охранное обязательство. Невыполнение этого требования является основанием для признания сделки недействительной

**Условия оплаты предмета аукциона:** победитель аукциона или единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 % (далее – единственный участник аукциона), обязан произвести оплату в размере 100 % стоимости имущества не позднее 15 рабочих дней с момента заключения договора купли-продажи

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.cpo.by.
Передача предмета аукциона победителю аукциона (единственному участнику аукциона), заключившему договор купли-продажи, производится по акту приема-передачи в течение 5 (пяти) рабочих дней с момента полной оплаты стоимости недвижимого имущества.
Победителю аукциона (единственному участнику аукциона) обратиться за государственной регистрацией перехода права собственности на недвижимое имущество после передачи ему имущества в установленном порядке.
Расходы, связанные с организацией и проведением торгов, заключением (удостоверением) договора купли-продажи, в том числе оплатой государственной пошлины, государственной регистрацией договора и перехода права собственности на недвижимое имущество, а также с удостоверением сделки, включая оплату государственной пошлины, несет победитель аукциона (единственный участник аукциона), заключивший договор купли-продажи

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

Предыдущее извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» 13.07.2019 г.

| | |
|---|---|
| **Дата и время проведения аукциона** | **25.09.2019 в 15.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»** |
| **Дата и время окончания приема документов** | **23.09.2019 до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»** |
| **Контактные телефоны** | **+375 17-280-36-37; +375 29-317-95-42. E-mail: auction@cpo.by** |



**Информационное сообщение о проведении аукциона по продаже гражданам Республики Беларусь в частную собственность земельных участков для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома в г. Смолевичи**

| | | |
|---|---|---|
| 1 | Форма проведения аукциона | Открытый |
| 2 | Дата, время и место проведения аукциона | г. Смолевичи, ул. Советская, 125. Смолевичский райисполком, зал заседаний, 08.10.2019 г. в 15.00 |
| 3 | Продавец и его адрес | г. Смолевичи, ул. Советская, 125, Смолевичский райисполком |
| 4 | Земельный участок, его кадастровый номер и адрес | Лот № 1 – площадь 0,1500 га, кадастровый номер 624850100008000214, г. Смолевичи, ул. Ф. Скорины, 25<br>Лот № 2 – площадь 0,1500 га, кадастровый номер 624850100008000735, г. Смолевичи, ул. Утульная, 5<br>Лот № 3 – площадь 0,1498 га, кадастровый номер 624850100001001009, г. Смолевичи, ул. Ивана Шамякина, д. 1<br>Лот № 4 – площадь 0,1137, кадастровый номер 624850100005000822, г. Смолевичи, ул. Короткевича (участок № 1)<br>Лот № 5 – площадь 0,1294, кадастровый номер 624850100005000821, г. Смолевичи, ул. Короткевича (участок № 2)<br>Лот № 6 – площадь 0,1500, кадастровый номер 624850100005000819, г. Смолевичи, ул. Михайловская (участок № 2) |
| 5 | Условия продажи | Без изменения целевого назначения |
| 6 | Целевое назначение земельных участков | Лот № 1 – 6 – для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома (1 09 02 земельный участок для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома) |
| 7 | Начальная стартовая цена | Лот № 1 – 20 000 рублей<br>Лот № 2 – 20 000 рублей<br>Лот № 3 – 20 000 рублей<br>Лот № 4 – 30 000 рублей<br>Лот № 5 – 30 000 рублей<br>Лот № 6 – 30 000 рублей |
| 8 | Условия аукциона | А) продажа по цене, не ниже начальной<br>Б) участниками аукциона могут быть граждане Республики Беларусь, постоянно проживающие на территории республики или приравненные к постоянно проживающим в соответствии с законодательными актами Республики Беларусь<br>В) наличие не менее двух участников<br>Г) без права предоставления рассрочки<br>Д) получить в установленном порядке техническую документацию и разрешение на строительство одноквартирного жилого дома;<br>восстановить границы земельного участка за счет средств победителя аукциона либо единственного участника несостоявшегося аукциона;<br>приступить к занятию (освоению) земельного участка в течение одного года со дня получения свидетельства (удостоверения) о государственной регистрации создания земельного участка и возникновения прав на него |
| 9 | Наличие инженерной инфраструктуры | Лот № 1– 3 – возможность подключения электроснабжения, газоснабжения, водоснабжения<br>Лот № 4–6 – возможность подключения электроснабжения, газоснабжения, водоснабжения, наличие асфальтированного подъезда |
| 10 | Условия оплаты | За безналичный расчет в течение 10 рабочих дней со дня подписания протокола по результатам проведения аукциона |
| 11 | Сумма задатка и реквизиты продавца | Получатель: Смолевичский районный исполнительный комитет<br>10% от начальной стартовой цены на р/с BY98 AKBB36410 000006696200000, БИК AKBBBY21612, ЦБУ 621 г. Смолевичи, филиала 612 ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Борисов, пр-т Революции, 47, УНП 600014139, ОКПО 04064735 (с пометкой «задаток за земельный участок») |

**Расходы по организации и проведению аукциона: лот № 1 – 299,83, лот № 2 – 1088,4, лот № 3 – 2126,21, № 4 – 1914,82, № 5 – 1844,01, № 6 – 1780,37), затраты на публикацию и размещение в сети Интернет информационного сообщения подлежат возмещению победителем аукциона. Затраты на строительство, в том числе проектирование, объектов распределительной инженерной и транспортной инфраструктуры к земельным участкам, подлежат возмещению в порядке и случаях, предусмотренных в соответствии с Указом Президента Республики Беларусь от 7 февраля 2006 г. № 72 «О мерах по государственному регулированию отношений при размещении и организации строительства жилых домов, объектов инженерной, транспортной и социальной инфраструктуры».**

**Порядок предварительного ознакомления на местности с продаваемым земельным участком – каждый четверг с 9.00 до 13.00.**

**Заявления на участие в аукционе с прилагаемыми к ним документами принимаются ежедневно в рабочие дни по адресу: г. Смолевичи, ул. Советская, д. 119.**

**Окончательный срок приема заявлений – 02.10.2019 г. до 17.00.**

Контактный телефон (8-01776) 2-73-42.

Для участия в аукционе на адрес продавца необходимо представить:
- заявление на участие в аукционе по установленной форме;
- документ, подтверждающий внесение суммы задатка (задатков);
- физическим лицам – документ, удостоверяющий личность (паспорт) покупателя или его доверенного лица, и доверенность, заверенную нотариально (в случае если интересы покупателя представляет это лицо)

Вядучая рубрыкі Алена КРАВЕЦ.
Тэл. (017) 287-18-36.

Пыталіся — адказваем

# ЛАСКАВЫ «ЗАБОЙЦА» ЗРОКУ

## Як узнікае глаўкома і як з ёй жыць?

**НАША чытачка з Мастоўскага раёна звярнулася ў рэдакцыю з просьбай расказаць пра глаўкому. Сёння гэтае захворванне — адна з галоўных прычын невылечнай слепаты ва ўсім свеце. Паводле прагнозаў Сусветнай арганізацыі аховы здароўя, колькасць хворых на глаўкому на планеце вырасце ў 2020 годзе да 76 мільёнаў чалавек. Што гэта за захворванне, чым яно небяспечнае, як яго своечасова распазнаць, захаваць зрок і весці паўнавартаснае жыццё, расказала ўрач-афтальмолаг вышэйшай катэгорыі медыцынскага цэнтра «ЛАДЭ» Ірына ХАРЛАНОВІЧ.**



***— Ірына Станіславаўна, як сябе праяўляе глаўкома?***

— Гэтае захворванне суправаджаецца павышэннем унутрывочнага ціску, звужэннем палёў зроку і прагрэсуючым парушэннем сілкавання зрокавага нерва, якое прыводзіць да хранічнай глаўкаматознай атрафіі зрокавага нерва. Прасцей кажучы, гэта хранічнае захворванне, якое вядзе да поўнай слепаты. Небяспека ў тым, што пацыенты могуць не заўважаць яго на пачатковых этапах. Спачатку паражаецца толькі адно вока, праз нейкі час — другое. Глаўкома пачынаецца з выпадзення палёў зроку, найчасцей у ніжнім насавым сегменце. А паколькі палі зроку правага і левага вока наслойваюцца адно на адно, то хворы можа не заўважаць гэтага выпадзення. І толькі выпадкова, калі чалавек закрывае адно вока, ён адчувае, што другое не бачыць. Адной з распаўсюджаных першых прыкмет з'яўляецца туман перад вачыма. Калі глядзець на лямпачку, якая свеціць, то хворыя бачаць перад вачыма вясёлкавыя кругі. Болю пры глаўкоме можа не быць: пры такіх павышаных лічбах унутрывочнага ціску, як 30—32, вока не выклікае непакою. А тым часам ідзе гібель зрокавых клетак.

***— Як выяўляюць глаўкому?***

— Найперш вымяраецца ўнутрывочны ціск. Акрамя гэтага, існуе комплекс неабходных абследаванняў. Праводзіцца гоніяскапія — гэта метад візуальнага абследавання пярэдняй камеры вока. Ён дазваляе вызначыць, як адбываецца адток унутрывочнай вадкасці. Робіцца камп'ютарная перыметрыя па глаўкомнай праграме — такім чынам мы вызначаем, наколькі звужана поле зроку. Таксама выконваецца сутачная танаметрыя — два разы ў дзень на працягу трох-пяці дзён вымяраецца вочны ціск, каб вызначыць розніцу паміж ранішнімі і вячэрнімі лічбамі, а таксама паказчыкамі правага і левага вока. Далей пацыенту робяць аптычную кагерэнтную тамаграфію — гэта сучасны метад камп'ютарнага даследавання зрокавага нерва і сятчаткі, ён дазваляе выявіць, наколькі яны пашкоджаны. Апроч таго, пацыент праходзіць УГД вока — вельмі інфарматыўны метад. Выконваюцца агляд у шчыліннай лямпе, вымярэнне памераў хрусталіка. Па выніках усіх гэтых абследаванняў ставіцца дыягназ, вызначаецца від глаўкомы і прымаецца рашэнне аб стратэгіі лячэння.

***— Ёсць пэўныя метады?***

— Лячэнне спачатку медыкаментознае. Калі яно не прыносіць эфекту, звяртаюцца да лазернага метаду, калі і ён безвыніковы, выконваюць хірургічнае ўмяшанне. Ёсць некалькі відаў прэпаратаў, якія выкарыстоўваюць пры лячэнні глаўкомы. Яно вядзецца ў максімальным рэжыме: прымяняюць увесь магчымы арсенал медыкаментаў і ацэньваюць эфект. Калі яго няма, звяртаюцца да лазернага лячэння. Гэта фістулізуючыя аперацыі, якія дапамагаюць аднавіць адток унутрывочнай вадкасці. Пры глаўкоме ён або ідзе з перашкодамі, або вадкасці прадуцыруецца зашмат. З дапамогай лазера робіцца дадатковыя адтуліны, і такім чынам адток паляпшаецца.

Задача любога метаду лячэння — нармалізаваць унутрывочны ціск і спыніць развіццё глаўкомы. Пры гэтым захворванні мы можам толькі пастарацца як мага даўжэй захаваць зрок на тым узроўні, на якім ён быў у момант выяўлення хваробы. А вось вярнуць страчаны, на жаль, не атрымаецца. Але пагадзіцеся, ёсць розніца, калі чалавек канчаткова страціць зрок — праз тры гады ці праз дзесяць.

***— Тады якім чынам захаваць зрок як мага даўжэй?***

— Адказным падыходам да лячэння: пастаянным прыёмам унутрывочных кропель, кантролем стану ў доктара, своечасовым правядзеннем лазернага лячэння ці хірургічнай аперацыі. Таксама важна прымаць сасудапашыральныя прэпараты, бо пры глаўкоме адбываецца хранічнае парушэнне кровазабеспячэння зрокавага нерва і трэба падтрымліваць яго сілкаванне. Таксама можна прымаць вітамінныя прэпараты, якія паляпшаюць сілкаванне сятчаткі. Гэтыя меры дапамогуць спыніць гібель клетак сятчаткі і зрокавага нерва.

***— На працягу якога перыяду можна абыходзіцца толькі кроплямі?***

— Калі з іх дапамогай удаецца кампенсаваць ціск, тады няма патрэбы ў лазерным лячэнні. І пяць, і дзесяць гадоў чалавек можа быць на кроплях.

***— Пасля лазернага лячэння кроплі адмяняюць?***

— Здараецца, што ў іх няма патрэбы, а бывае, што яны дапаўняюць лячэнне, але прызначаюцца ў меншым рэжыме.

***— За які перыяд адбываецца поўная страта зроку?***

— Ва ўсіх па-рознаму. Калі адказна ставіцца да лячэння, назірацца ва ўрача, то можна захаваць зрок надоўга.

***— Але глаўкома нават пасля лазернага ці хірургічнага ўмяшання ўсё ж прагрэсуе?***

— Так, гэта хранічнае захворванне. І пры належным лячэнні яно хоць і вельмі марудна, але прагрэсуе.

***— Што такое другасная глаўкома?***

— Яна развіваецца на фоне іншых захворванняў. Часцей за ўсё — на фоне траўмаў, увеітаў (запаленняў сасудзістай абалонкі вока), можа развіцца ў постаперацыйны перыяд. Гэта вынік ранейшага захворвання, якое прывяло да парушэння цыркуляцыі ўнутрывочнай вадкасці і павышэння вочнага ціску. Часам другасная глаўкома ўзнікае на фоне парушэння кровазабеспячэння ў зрокавым нерве па артэрыяльным і венозным тыпах — пры трамбозах цэнтральных вен ці артэрый сятчаткі. Такія глаўкомы працякаюць цяжэй і горш за астатнія лечацца.



***— У чым розніца адкрытавугольнай і закрытавугольнай глаўкомы?***

— Нават у першых прыкметах і выяўляльнасці. З адкрытавугольнай глаўкомай пацыент можа жыць некалькі гадоў і не здагадвацца пра яе. Яна «не баліць», і падазраваць хваробу ён пачынае, калі выпадкова заплюшчвае адно вока і адчувае, што дрэнна бачыць другім. Пры закрытавугольнай глаўкоме ўзнікае прыступ — рэзка павышаецца ўнутрывочны ціск, баліць вока і палова галавы, з'яўляюцца млоснасць, ірвота. Часам клінічную карціну вострага прыступу глаўкомы блытаюць з гіпертанічным крызам. Нават здараецца, што пацыентаў адвозяць у кардыялагічныя аддзяленні. Такі прыступ патрабуе неадкладнай дапамогі, бо чым даўжэй яна не аказваецца, тым больш зніжаюцца зрокавыя функцыі і складаней прывесці вока да нарматонусу.

***— Глаўкома паражае спачатку адно вока. А ці можна не дапусціць яе ўзнікнення ў другім?***

— Пры другаснай глаўкоме можа паражацца толькі адно вока, пры першаснай — заўсёды абодва, гэта двухбаковае захворванне. З прамежкам у 1-2-5 гадоў захварэе і другое вока.

***— Калі ўнутрывочны ціск павышаны, як часта яго трэба вымяраць?***

— У такім выпадку ён вымяраецца штомесячна. Прэпараты для лячэння глаўкомы ўваходзяць у пералік бясплатнага водпуску, рэцэпт пацыенту выпісваецца на адзін месяц. Таму штораз ён мусіць прыходзіць да ўрача і абследавацца. А пры прызначэнні або змене прэпаратаў, якія паніжаюць ціск, мы кантралюем яго яшчэ часцей — раз на тры-пяць дзён.

***— Ці можна з глаўкомай займацца фізічнай працай, мець фізічныя нагрузкі, глядзець тэлевізар, чытаць?***

— Цяжкія фізічныя нагрузкі не рэкамендуюцца, асабліва пры закрытавугольнай глаўкоме. Нельга працаваць і спаць тварам уніз, бо пры гэтым зрушваюцца структуры вока, яшчэ горш цыркулюе вочная вадкасць і такім чынам павышаецца ўнутрывочны ціск. Не рэкамендуецца такім пацыентам бываць на яркім сонцы, парыцца ў лазні, лепш не ўжываць шмат вадкасці і салёнай ежы.

**«Болю пры глаўкоме можа не быць: пры такіх павышаных лічбах унутрывочнага ціску, як 30—32, вока не выклікае непакою. А тым часам ідзе гібель зрокавых клетак».**

***— Калі на глаўкому хварэе чалавек працаздольнага ўзросту, ён можа працаваць без абмежаванняў?***

— Ёсць крытэрыі для ўстанаўлення групы інваліднасці пры глаўкоме. Як правіла, гэта адбываецца з чацвёртай, самай запушчанай стадыяй. На астатніх стадыях гэтага захворвання можна працаваць.

***— І за камп'ютарам?***

— Так, толькі трэба прымяняць увільгатняльныя кроплі для дадатковага сілкавання вачэй, якія прадухіляюць перасыханне слізістай.

***— Хто рызыкуе захварэць на глаўкому?***

— У развіцці гэтай хваробы істотную ролю адыгрывае спадчынны фактар. Калі яна ёсць у сямейным анамнезе, неабходна кантраляваць унутрывочны ціск. Таксама ў групе рызыкі людзі з высокай ступенню блізарукасці ці дальназоркасці, тыя, хто перанёс траўмы і запаленчыя працэсы, людзі з паніжаным ці высокім артэрыяльным ціскам, тыя, хто пакутуе на цукровы дыябет, эндакрынныя, нервовыя і сасудзістыя хваробы. Кантраляваць унутрывочны ціск рэкамендуецца ўсім пасля 40 гадоў.

## ВЫЯЗНАЯ ПАЛІКЛІНІКА ПРЫМАЕ БЕЗ ТАЛОНАЎ

**Сёння на базе сталічнага гандлёвага цэнтра Dana Mall (вул. Пятра Мсціслаўца, 11) з 10 да 14 гадзін працуе выязная паліклініка гарадскога Цэнтра здароўя.**

Усе ахвотныя могуць атрымаць кансультацыі па вядзенні здаровага спосабу жыцця і правільным харчаванні, паразмаўляць з псіхолагам, а таксама змераць артэрыяльны ціск, зрабіць электракардыяграму, даведацца аб частаце сардэчных скарачэнняў і ступені насычэння артэрыяльнай крыві кіслародам. З 10 да 12 гадзін можна змераць узровень глюкозы ў крыві (нашча).

Як растлумачыла кіраўнік гарадскога Цэнтра здароўя Сняжана Каўрыга, за восем месяцаў правядзення Дзён здароўя ў паліклініках, аптэках, гіпермаркетах, на рынках і іншых месцах акцыі наведала 480 тысяч чалавек. Каля 84 % з іх адзначылі ў сябе наяўнасць пэўных фактараў рызыкі. Сярод іх нерацыянальнае харчаванне, нізкая рухальная актыўнасць, лішняя вага, курэнне і ўжыванне алкаголю.

## РАЗВІВАЛЬНЫЯ ПЛАНШЭТЫ ДА 1 ВЕРАСНЯ

**Дабрачынную акцыю Беларускага таварыства Чырвонага Крыжа «Збяром дзяцей у школу!» падтрымала кампанія А1.**

Да новага навучальнага года былі набыты канцылярскія тавары, магнітныя дошкі і развівальныя планшэты для Сацыяльна-педагагічнага цэнтра з прытулкам Цэнтральнага раёна Мінска і Дзіцячага дома-інтэрната для дзяцей-інвалідаў з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця.

«Збяром дзяцей у школу!» — рэспубліканская дабрачынная акцыя, якую штогод напярэдадні 1 верасня праводзіць Беларускі Чырвоны Крыж, каб дапамагчы падрыхтавацца да Дня ведаў дзецям са шматдзетных і няпоўных сем'яў, сем'яў бежанцаў ці вымушаных перасяленцаў, а таксама дзецям з інваліднасцю.

# БУДУЧЫНЯ — ЗА ТВОРЧЫМ СУПРАЦОЎНІЦТВАМ

**Міжнародны круглы стол «Мастацкая літаратура як шлях адно да аднаго» сёлета прайшоў у Жыровіцах і сабраў паэтаў, празаікаў, літаратуразнаўцаў і выкладчыкаў з розных рэгіёнаў Беларусі і больш чым дзесяці краін свету.**

«Мы часта спрачаліся, дзе варта збірацца: у Мінску ці ў тых гарадах, дзе праводзіцца свята, і выбралі ўсё ж другі варыянт. Для вас гэта магчымасць лепш пазнаёміцца з нашай краінай, убачыць на свае вочы тыя ўнікальныя краявіды і памятныя мясціны, якімі ганарыцца канкрэтная мясцовасць», — зазначыў **міністр інфармацыі Беларусі Аляксандр КАРЛЮКЕВІЧ,** вітаючы ўдзельнікаў круглага стала. Сапраўды, камплімэнтаў на адрас Беларусі з боку замежных гасцей гучала нямала, але перадусім літаратары прадстаўлялі свае новыя творы і даследаванні, абмяркоўвалі існуючыя літаратурныя сувязі і будучыя сумесныя праекты.

Як нават адзінкавы факт з біяграфіі пісьменніка можа выліцца ў цікавае міжнароднае супрацоўніцтва, расказаў **намеснік галоўнага рэдактара часопіса «Полымя», літаратуразнаўца Мікола ТРУС.** Ён згадаў, што ў 1935 годзе пасля заключэння паміж СССР і Чэхаславакіяй дагавора аб узаемадапамозе адбыўся абмен дэлегацыямі культурных дзеячаў. У склад савецкай дэлегацыі разам з Аляксеем Талстым, Аляксандрам Фадзеевым, Іванам Мікітэнкам і іншымі пісьменнікамі і журналістамі ўвайшоў беларускі паэт Янка Купала. Кожны крок дэлегацыі СССР абмяркоўваўся ў славацкай прэсе — ад ухвальных справаздач да крытычных артыкулаў і фельетонаў, давалася нават падрабязнае апісанне знешнасці літаратараў, але таксама ў гутарках з савецкімі дэлегатамі ўздымаліся і сур'ёзныя тэмы — праблемы малых народаў, фашысцкай пагрозы і г. д. Адносна нядаўна землякам удалося знайсці кнігі з аўтографамі Янкі Купалы і невядомыя здымкі савецкай дэлегацыі. «Праведзеныя даследаванні сталі асновай маёй манаграфіі «Янка Купала ў Славакіі», якая выйшла ў 2012 годзе, а ў 2015-м пры падтрымцы дыпламатычнага корпуса абедзвюх краін быў зладжаны міжнародны культурны праект «Славацкімі шляхамі Купалы», удзельнікі якога, сучасныя беларускія пісьменнікі, журналісты і навукоўцы, паўтарылі шлях савецкай дэлегацыі. Падчас гэтага праекта былі дасягнутыя дамоўленасці аб ушанаванні ў гарадах Славакіі памяці паэта і ўстанаўленні памятных знакаў», — сказаў Мікола Трус.


Дэлегацыя літаратараў з Узбекістана зрабіла Міністэрству інфармацыі Беларусі падарунак — здымак помніка Якубу Коласу ў Ташкенце.

У ролі не толькі дыпламата, але і пісьменніка ўдзельнічала ў рабоце круглага стала **Надзвычайны і Паўнамоцны пасол Індыі ў Беларусі Сагніта БАХАДУР.** «На маю думку, літаратура — сапраўды тое, што аб'ядноўвае ўсіх людзей, незалежна ад нацыянальнасці і веравызнання, дапамагае кожнаму з нас раскрыць у сабе найлепшыя якасці. І перадусім гэта датычыцца майго любімага жанру фэнтэзі. Ён старажытны, і ўсе мы яго добра ведаем, бо раслі на казках і паданнях народаў свету. А сёння фэнтэзі як ніякі іншы жанр дазваляе знайсці ў сабе нешта падобнае да герояў, а разам з тым ненавязліва, мякка прадстаўляе чытачу іншыя сусветы, не падобныя на звыклае атачэнне кожнага з нас», — расказала яна.


Надзвычайны і Паўнамоцны пасол Індыі ў Беларусі Сагніта БАХАДУР сама займаецца мастацкай літаратурай і падтрымлівае літаратурныя і выдавецкія стасункі паміж нашымі краінамі.

Вядомы **польскі пісьменнік і рэпарцёр, член Рускага геаграфічнага таварыства і Каралеўскага геаграфічнага таварыства ў Лондане Яцэк ПАЛКЕВІЧ,** за плячыма якога больш чым паўвека падарожжаў па ўсім свеце, ад экзатычных выспаў да залатых руднікоў Ганы, ад пустыні Гобі да полюса холаду ў Аймяконе, пераканаты, што нацыянальныя культуры і літаратуры — ледзь не галоўны сродак супрацьстаяння працэсам глабалізацыі і ўніфікаванага ладу жыцця. «Падчас сваіх вандровак я не толькі вывучаў культурны досвед высокацывілізаваных нацый, але і многаму навучыўся ў далёкіх карэнных плямёнаў, і адна з важных мудрасцяў, якую я пачуў у падарожжах, нагадвае пра тое, што суседзі цераз блізкую мяжу важнейшыя за брата за гарой. Нашы краіны звязаныя не толькі суседствам, але і гістарычным лёсам, а таму, на мой погляд, мусяць наладжваць больш шчыльнае партнёрства — у тым ліку літаратурнае».

**Філолаг, краязнаўца, публіцыст і выкладчык Глеб КУДРАШОЎ** якраз прывёз з Палтаўскага нацыянальнага педагагічнага ўніверсітэта сведчанне такога партнёрства: томік «Энеіды» Івана Катляравскага ў перакладзе на беларускую Аркадзя Куляшова з аўтографам народнага паэта Беларусі. У гэтай літаратурнай знаходцы, можна сказаць, сышліся зоркі і сімвалічныя лічбы: пераклад паэмы-бурлеска, які быў выдадзены ў 1969-м у Мінску — да 200-годдзя з дня нараджэння Катлярэўскага, адшукалі ў Палтаве праз 50 гадоў — акурат на 105-ю гадавіну з дня нараджэння Куляшова. «Мне вельмі сумна, што сёння Саматэвічы, родная вёска Аркадзя Куляшова, знаходзіцца ў зоне адсялення пасля аварыі на ЧАЭС, але разам з тым радасна, што цяпер мы маем яшчэ адзін агульны пункт судатыкнення ў літаратурнай сістэме каардынат і што сумесныя праекты ў гэтай сферы безумоўна будуць працягвацца», — падзяліўся эмоцыямі ўкраінскі даследчык.

Лінію мінуўшчыны і сучаснасці злучыў таксама госць з Санкт-Пецярбурга Аляксандр Карскі — праўнук акадэміка Пецярбургскай і Чэшскай акадэмій навук Яўхіма Карскага, філолага, палеографа і этнографа, праца якога (у прыватнасці, трохтомнае выданне «Беларусы») заклала фундамент айчыннага навуковага мова- і літаратуразнаўства. Нашчадак знакамітага вучонага прысвяціў 17 гадоў жыцця складанню двухтомніка, у якім падрабязна разглядаюцца біяграфія Яўхіма Карскага і яго роля ў папулярызацыі беларускага фальклору, мовы і літаратуры.

**Першы намеснік старшыні Саюза пісьменнікаў Узбекістана Мінхажыдзін ХАДЖЫМАТАЎ** нагадаў, што культурныя сувязі паміж нашымі краінамі маюць плён: узаемныя пераклады класічных твораў літаратуры, адкрыццё помніка Якубу Коласу ў Ташкенце і Алішэру Наваі ў Мінску, правядзенне сёлета Дзён культуры Узбекістана ў Беларусі... А зусім нядаўна ў Ташкенце пры падтрымцы грамадскага фонду «Творчасць» убачыў свет зборнік беларускіх паэтаў у перакладзе на ўзбекскую.

Таксама неўзабаве выйдзе з друку першы літаратурны альманах «Казастан—Беларусь», куды ўключаны творы аўтараў пачатку XXI стагоддзя. «Супрацоўніцтва ў гэтай сферы не толькі зближае нашы народы, але таксама ўбудоўвае нашы літаратуры ў сусветны культурны працэс», — адзначыла **загадчык аддзела аналітыкі і знешніх літаратурных сувязяў Інстытута літаратуры і мастацтва Міндукацыі і навукі Рэспублікі Казахстан Святлана АНАНЬЕВА.**

«Размежаванне, раз'яднанне — прамы шлях да варожасці, — пераканаы **паэт, эсэіст, перакладчык і публіцыст з Расіі Уладзімір БЕРАЗЕЎ,** які больш за дзесяць гадоў узначальваў літаратурны часопіс «Сібірскія агні», — а таму мы робім усё магчымае, каб наноў аб'яднаць пісьменнікаў нашых краін. З 2003 да 2014 года на старонках «Сібірскіх агнёў» былі апублікаваны больш чым два дзясяткі беларускіх аўтараў, а ў канцы 2009-га адзін з нумароў быў цалкам прысвечаны беларускай паэзіі і адкрыў для расійскага чытача мноства цікавых, раней не вядомых аўтараў...»

Адзін з выдатных спосабаў зберагчы родную мову і літаратуру — папулярызаваць яе за мяжой, мяркуе **прафесар гісторыі Рымскага ўніверсітэта La Sapienza Франчэска ГУІ.** Ён прывёў у прыклад Святлану Алексіевіч — пасля атрымання беларускай пісьменніцай Нобелеўскай прэміі па літаратуры ў Італіі вельмі зацікавіліся не толькі яе творчасцю, але і іншымі беларускімі аўтарамі, таму варта разгледзець перспектывы іх перакладу на італьянскую.

Гэтую ж думку падтрымаў **член Саюза пісьменнікаў Грузіі, паэт і перакладчык Аляксандр ЭЛЕРДАШВІЛІ,** які займаўся перакладамі санетаў Янкі Купалы: «У мяне ёсць жаданне выдаць на грузінскай анталогію беларускай паэзіі, а на беларускую, у сваю чаргу, перакласці шэдэўры сусветнай літаратуры — у прыватнасці, я даўно рэалізую праект па перакладзе вершаў Амара Хаяма на розныя мовы свету».

«Я згодны з калегамі, што на шляху адно да аднаго вельмі важна мець праваднікоў — у літаратуры гэта перакладчык, — дадаў **празаік, эсэіст і драматург з Малдовы Мікалай РУСУ.** — Неабходна запоўніць той вакуум, які ўтварыўся паміж нашымі краінамі пасля распаду СССР, якаснымі перакладамі класічных і сучасных твораў». Сваё перакананне літаратар падмацаваў лічбамі: вывучыўшы бібліятэчныя фонды ў адным з найбуйнейшых кнігасховішчаў Малдовы, ён падлічыў, што ў перыяд 1965—1990 гадоў у краіне было выдадзена 17 кніг беларускіх пісьменнікаў, а таксама 19 зборнікаў паэзіі і анталогія прозы «Вяснянка», у якую ўвайшлі 42 аўтары, а з пачатку XXI стагоддзя ў Бухарэсце былі надрукаваныя толькі тры кнігі беларускіх пісьменнікаў...

Усе ўдзельнікі круглага стала пагадзіліся, што сітуацыю трэба змяняць да лепшага — тым больш творчых ідэй і імпэту для гэтага хапае. Абмеркаванне кірункаў літаратурнага супрацоўніцтва працягнецца ўжо гэтай восенню — 3-4 кастрычніка ў Магілёве пройдзе пленум пісьменнікаў Саюзнай дзяржавы.

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**
**Фота Канстанціна ДРОБАВА.**
*Жыровіцы — Мінск.*


Удзельнік міжнароднага круглага стала Глеб КУДРАШОЎ прывёз з Палтавы «Энеіду» ў перакладзе Аркадзя Куляшова з аўтографам народнага паэта БССР.

## У вершах і прозе

**Падчас Дня беларускага пісьменства ў Слонімскім драматычным тэатры прайшоў фінал Рэспубліканскага конкурсу юных чытальнікаў «Жывая класіка».**

Сёлета ўдзел у творчым спаборніцтве бралі амаль 13 тысяч школьнікаў з усіх рэгіёнаў Беларусі, а ў фінале выступілі 15 найлепшых чытальнікаў з Брэста, Гомеля, Докшыц, Мінска, Петрыкава, Магілёва, Віцебска, іншых гарадоў і вёсак.

Шукаючы блізкія ім па духу творы, асабліву ўвагу дэкламатары і іх настаўнікі аддалі тэме любові да малой радзімы, а таксама 75-годдзю вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Пераможцаў конкурсу ў чатырох узроставых катэгорыях (1—4 класы, 5—6, 7—8 і 9—10) вызначала прафесійнае журы на чале з міністрам інфармацыі Беларусі Аляксандрам Карлюкевічам.

Першымі сярод найлепшых пасля гарачых спрэчак суддзі назвалі 8-гадовую вучаніцу петрыкаўскай гімназіі Паліну Пінчук, без пяці хвілін выпускніка, валанцёра ЮНІСЕФ і дзеючага тэлевядучага Мікіту Шпілеўскага з Гомеля, а таксама адразу дзвюх прадстаўніц Докшыц: шасцікласніцу Тумілавіцкага дзіцячага сада — сярэдняй школы Марыю Наско і вучаніцу гарадской СШ № 2 Віялету Будзько, якая дайшла да фіналу «Жывой класікі» ўжо трэці раз і нарэшце перамагла. Зрэшты, дыпломы Міністэрства адукацыі, заахвочвальныя прызы і падарункі ад партнёраў праекта атрымалі ўсе фіналісты конкурсу.

**ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга»** (организатор аукциона) **по поручению ОАО «Гомельоблстрой»** (продавец) **в лице антикризисного управляющего в деле о банкротстве Колеснева Н. М. извещает о проведении 20 сентября 2019 года открытого повторного аукциона по продаже имущества со снижением начальной цены на 50 % по продаже имущества в 11.00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20, 2-й этаж**

| № лота | Наименование предметов торгов | Начальная цена продажи имущества, без учета НДС (20 %), бел. руб. | Шаг аукциона – 5 %, бел. руб. | Сумма задатка, без учета НДС (20 %), бел. руб. |
|---|---|---|---|---|
| **Условие продажи:** 1. Претендент на покупку (победитель) аукционных торгов самостоятельно и за свой счет проводит демонтаж, погрузку, транспортировку приобретенного на аукционе имущества. В случае нарушения целостности имущества Продавца при демонтаже и погрузке приобретенного имущества на Покупателя возлагается обязанность по приведению поврежденного имущества в первоначальное состояние. 2. Действия по снятию с регистрационного учета транспортных средств, а также в случае необходимости получения регистрационных документов (при их отсутствии у Продавца) производится Покупателем на основании выданной доверенности Продавцом, за его счет и его силами. Переоформление документов на автотехнику и механизмы производится за счет покупателя. 3. В соответствии с действующим законодательством РБ (в части изменения подпункта 2.30 пункта 2 статьи 115 в Налоговом кодексе РБ с 1 января 2019 года) **реализация имущества осуществляется без учета НДС 20 %. Местонахождение лотов** №№ 2, 6, 7: Гомельская обл., г. Чечерск, ул. Советская, 42 | | | | |
| **2** | **Виброкаток двухколесный LTC06,** инв. № 841 | **5 000,00** | 250,00 | 500,00 |
| **6** | **Автомобиль грузовой седельный тягач МАЗ-5440А8 360031,** кузов (рама) № Y3M5440A880001526, 2008 года выпуска, рег. знак АВ 7249-3, № инв. 2062 | **13 200,00** | 660,00 | 1 320,00 |
| **7** | **Автомобиль грузовой самосвал МАЗ-5551 А2 325,** кузов (рама) № Y3M5551A280001267, 2008 года выпуска, рег. знак АК 8654-3, № инв. 801. **Прицеп-самосвал МАЗ 8571,** кузов (рама) № Y3M85710080004471, 2008 года выпуска, рег. знак А 2344 А-3, № инв. 901 | **14 050,00** | 702,50 | 1 405,00 |
| **8** | **Пожарная сигнализация** (инв. № 32). Местонахождение: г. Гомель, ул. Советская, 74 | **9 150,00** | 457,50 | 915,00 |

**Продавец:** ОАО «Гомельоблстрой», г. Гомель, ул. Малайчука, 12. **Порядок ознакомления с имуществом осуществляется по контактным тел.:** 8 (029) 185-37-18 – управляющий в деле о банкротстве Колеснев Николай Михайлович; 8 (044) 700-40-60 – по спецтехнике и оборудованию Кучинский Владимир Александрович; 8 (044) 769-19-61, 8 (0232) 53-27-62 – по недвижимости Яроцкая Людмила Николаевна. Шаг аукционных торгов – 5 (пять) % от начальной цены предмета аукциона и не изменяется в течение всего аукциона. Для участия в аукционе необходимо: 1. Оплатить задаток на расчетный счет **Продавца (ОАО «Гомельоблстрой»): р/с BY73 BLBB 3012 0400 0516 9300 1001, в Головной ф-л по Гомельской области ОАО «Белинвестбанк», БИК BLBBBY2X, УНП 400051693,** назначение платежа – задаток за участие в аукционных торгах по лоту № (задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления); 2. Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов можно с 4 сентября 2019 г. по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 20, 2-й этаж, каб. «Эксперт-Услуга» в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 16.00. Прием заявлений для участия в аукционе **заканчивается 18 сентября 2019 г. в 16.00 включительно (предварительно по контактным телефонам Организатора торгов).** Заявления, поступившие после установленного срока, не принимаются. Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее, чем за 5 (пять) дней до его проведения.

